# ЗМЕНЫ Ў ПАЛІТЫЦЫ ФАРМІРАВАННЯ ДЗЯРЖАЎНАГА АПАРАТУ Ў БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ У 1830–1850-Х ГГ.

**А. Д. Чэрнік**

*chernikalla@mail.ru;*
*Навуковы кіраўнік – А. Я. Верамейчык, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

У артукуле разглядаюцца праблемы па фарміраванню дзяржаўнага апарата: прыцягненне рускіх чыноўнікаў з вялікарасійскіх губерняў і дазвол служыць не зацверджаным у дваранстве былым шляхцічам. Аўтар вызначае ролю Камітэта заходніх губерняў у ажыццяўленні гэтых мерапрыемстваў абапіраючыся на журналы Камітэта. Аўтар прыходзіць да высновы, што палітыка па ўмацаванню кіраўнічага апарата рускімі чыноўнікамі не дасягнула жаданага выніку па фінансавым прычынам.

***Ключавыя словы:*** Расійская імперыя; Заходні край; Камітэт заходніх губерняў; М. А. Далгарукаў; ваенная служба; грамадзянская служба; рускія чыноўнікі.

## УВОДЗІНЫ

Пасля паўстання 1830–1831 гг. перад уладамі стала задача камплектавання дзяржаўнага апарату надзейнымі кадрамі. Ва ўсіх губернатарскіх запісках гаварылася пра тое, што дзяржаўны апарат трэба ўмацоўваць чыноўнікамі з вялікарасійскіх губерняў.

## МАТЭРЫЯЛЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

На пасяджэнні Камітэта заходніх губерняў 5 сакавіка 1832 г. была разгледжана запіска віленскага ваеннага губернатара М. А. Далгарукава аб прадастаўленні некаторых пераваг рускім чыноўнікам: «Перавагі гэтыя, на думку князя Далгарукава, маглі б заключацца ў тым: 1-е. Каб выдаваць азначаным чыноўнікам пры вызначэнні да пасад усім без канфіскацыі прагоны па чыне і адлегласці. 2. Каб тым з іх, якія за ранейшую службу, ваенную або грамадзянскую, атрымалі пенсіі, захоўваць гэтыя пенсіі звыш выканання жалавання па пасадзе. 3-е. Каб таму, хто праслужыў адзін год на штатнай пасадзе, не звыш, аднак жа, дарадчай, калі ён па такім гадавым выпрабаванні акажа сябе для службы сапраўды карысным, даваць наступны чын, але з тым, каб ён працягваў служыць у тым жа краі яшчэ тры гады, у адваротным выпадку чын гэты з яго здымаць» [1, с. 189]. Камітэт пагадзіўся толькі на першыя два пункты: «Камітэт, суадносячы такія палажэнні з агульнымі ўзаконеннямі і з асаблівымі распараджэннямі ўрада датычна замяшчэння адкрываючыхся ў заходніх губернях вакансій рускімі чыноўнікамі, не знаходзіць ніякай нязручнасці, па вытлумачаным генерал-ад'ютантам

Далгарукавым шанаванням, пагадзіцца на прысваенне чыноўнікам гэтых пераваг, якіх просіць ён ім у першых двух пунктах сваёй запіскі; пра што і мяркуе, у выпадку дазволу на тое яго імператарскай вялікасці, абвясціць праз міністра юстыцыі найвышэйшы загад Урадавага Сенату» [1, с. 189]. У такім выглядзе гэтыя правілы былі зацверджаны ўказам імператара 15 красавіка 1832 г. для Віленскай і Гродзенскай губерняў. 27 снежня 1832 г. льгота ў выглядзе прагону была прадастаўлена настаўнікам і служачым Міністэрства народнай асветы. 21 жніўня 1834 г. прагоны рускім чыноўнікам даваліся ў Мінскай губерні і Беластоцкай вобласці. У красавіку 1842 г. рускія чыноўнікі ў Беластоцкай вобласці атрымалі тыя ж перавагі, што былі ў Гродзенскай і Віленскай губернях. Але ўсе гэтыя меры апынуліся малаэфектыўнымі, пра што ў 1836 г. на пасяджэнні Камітэта міністраў дакладваў міністр народнай асветы С. С. Увараў. Жадаючых адправіцца ў заходнія губерні на службу было вельмі мала. Таксама ва ўжо прыехаўшых узнікалі фінансавыя праблемы. У 1832 г. магілёўскі губернатар Г. І. Бажанаў казаў пра тое, што чыноўнікі, якія прыехалі ў Магілёўскую і Віцебскую губерні, атрымлівалі беднае жалаванне і не маглі сябе забяспечыць. Пасля ўказа 15 красавіка 1832 г. дадзеныя чыноўнікі з'язджалі ў іншыя заходнія губерні. Таму магілёўскі губернатар прасіў 3 тыс. руб. для губернскага праўлення і 5 тыс. руб. для ўтрымання чыноўнікаў у губерні [3, с. 67].

На пасяджэнні Камітэта заходніх губерняў 20 студзеня 1838 г. зноў было ўзнята пытанне аб прадастаўленні льгот для расійскіх чыноўнікаў. Дадзеную меру прапаноўваў віленскі генерал-губернатар М. А. Далгарукаў: «Нарэшце, згодна з заўвагай невядомага, князь Далгарукаў лічыць неабходным замяшчэнне ў Заходнім краі пасад карыснымі для службы чыноўнікамі; для чаго ён мяркуе вызначальным туды прадастаўляць такія перавагі, якія маглі б прыцягнуць цалкам годных людзей і распачаць у іх спаборніцтва» [2, с. 264]. Але Камітэт выступіў супраць надзялення дадатковых ільгот: «Што ж тычыцца да пераваг чыноўнікаў, то Камітэт не можа выкласці ніякага аб гэтым заключэння, бо князь Далгарукаў не тлумачыць, якія б перавагі здольныя былі прыцягваць годных чыноўнікаў пераважна на службу ў Заходніх губернях. Па найноўшых штатах утрыманне служачых у губернях наогул досыць палепшана; тыя, якія вызначаюцца ў Заходнія губерні карыстаюцца звыш таго рознымі дапамогамі па асаблівым распараджэнням; нарэшце, перш за ўсякае далейшае аб гэтым распараджэнне, належыць па справядлівасці чакаць дзеянні нядаўна вышаўшага найвышэйшага загаду, па якім маладых людзей, якія закончылі курс вучэння ў утрыманых урадам навучальных установах, забаронена прымаць на службу пры вышэйшым упраўленні перш

выслугі пэўнага тэрміну ў губернях. Мера гэтая значна больш здольная забяспечыць губернскія ўпраўленні годнымі і па відах гонару служыўшымі чыноўнікамі, чым усталяванне выключных мясцовых пераваг, якія, як вопыт па іншых краях досыць даказвае, вядома вабяць сабою часовых шукальнікаў выгод, але рэдка карысных і руплівых да службы людзей» [2, с. 264]. Таксама ў згаданым вышэй загадзе 23 студзеня 1837 г. гаварылася аб тым, што дваране-каталікі з заходніх губерняў для службы чыноўнікамі адпраўляліся на 5 гадоў ва ўнутраныя губерні для навучання рускай мове. У 1841 г. Камітэт зноў адхіліў планы мясцовай адміністрацыі па перасяленню ў заходнія губерні расійскіх чыноўнікаў [3, с. 67].

Варта адзначыць, што ні на адным пасяджэнні Камітэта заходніх губерняў не разглядаліся меры па стварэнні перашкод для дваран заходніх губерняў быць чыноўнікамі. Пры гэтым члены Камітэта, не падзяляючы меркаванне кіеўскага генерал-губернатара Д. Г. Бібікава і гродзенскага губернатара М. М. Мураўёва аб неадкладным звароце асоб, якія не даказалі дваранства ў грамадзяне і аднадворцы, выступалі за прадастаўленне ім права служыць. Улады не маглі пайсці на тое, каб адняць права службы ў не зацверджанай Герольдыяй шляхты, бо адразу пазбавіліся б большасці чыноўнікаў, аснову якіх складалі якраз выхадцы з дробнашляхецкага асяроддзя [4, с. 156]. Што тычыцца ваеннай службы, то было пастаноўлена наступнае: «У службу ваенную на падставе ўказа 1832 года прымаюцца і цяпер належачыя да былой шляхты асобы, якія не даказалі канчаткова правоў сваіх на дваранства; у гэтых адносінах не патрабуецца ніякай змены існуючых пастаноў» [2, с. 402]. Па грамадзянскай службе меркавалася наступнае: «А таму міністр юстыцыі мяркуе цяпер прыём у службу дапусціць па сведчаннях камісій, заснаваных для рэвізіі дзеянняў дваранскіх дэпутацкіх сходаў, з тым аднак жа, каб сведчанні гэтыя не былі прызнаныя канчатковым сцвярджэннем дваранства, а служылі толькі пасведчаннем аб асобах першага разраду, што яны да 1831 года валодалі населенымі маёнткамі; аб асобах жа другога разраду, што яны прад'явілі ўжо доказы свае на дваранскую годнасць. Першым належыць дазволіць працягваць грамадзянскую службу, як да зацвярджэння іх у дваранстве, так і ў выпадку канчатковай у тым адмовы, на праве асабістых дваран (для якіх тэрмін выслугі да афіцэрскага звання ўсталяваны 4-хгадовы), апошніх жа прылічаць на той жа падставе да канцылярскіх служыцеляў 3-га разраду, для якіх азначаны тэрмін усталяваны 6-цігадовы; і прытым асобам абодвух разрадаў, у выпадку зацвярджэння пасля дваранскага іх права, прадастаўляць усе перавагі, званню гэтаму на службе прысвоеныя, з вяртаннем па грамадзянскай частцы і наступнага ім старшынства»

[2, с. 401]. Нязменным патрабаваннем для паступлення на грамадзянскую і ваенную службу заставалася прадастаўленне сведчанняў аб недатычнасці да паўстання. Але ў 1843 г. гэтае патрабаванне адмянілі для тых, каму было 16 гадоў і менш на момант паўстання 1830–1831 гг. [3, с. 68].

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

У выніку можна сказаць, што палітыка па ўмацаванні кіраўнічага апарата рускімі чыноўнікамі не дасягнула жаданага выніку. Гэта можна звязаць з фінансавымі прычынамі. Грашовае забеспячэнне ніжэйшага і сярэдняга чынавенства было невысокім. Напрыклад, пісар ніжэйшага разраду ў Гродзенскай губерні ў 1837 г. атрымліваў у земскім судзе 42 руб. жалавання і 28 руб. на абмундзіраванне ў год, што складала каля 6 руб. у месяц. У Віцебскай губерні такі ж чыноўнік атрымліваў яшчэ менш: 3-5 руб. у месяц. Па цэнах на 1837 г. чыноўнік з Гродзенскай губерні мог купіць 35 кг свінога сала, або 30 кг масла, або 120 кг ялавічыны, або 3 вядра гарэлкі, або 3 бочкі піва. Пражыць на такія грошы чыноўніку было складана. Забеспячэнне чыноўнікаў на кіруючых пасадах было нашмат лепш. Губернатар у 1837 г. атрымліваў 3397 руб. у год, не ўлічваючы іншыя субсідыі. Дадзенае жалаванне было ў 50 разоў больш, чым у канцылярскага служачага. А ў 1845 г. жалаванне ў губернатараў было падвышана да 6296 руб. Так урад мог прызначаць рускіх чыноўнікаў на вышэйшыя пасады. Дробныя чыноўнікі не хацелі ехаць у незнаёмы край без добрага жалавання. У выніку, у сярэдзіне XIX ст. доля мясцовых ураджэнцаў у губернскіх і павятовых установах была 58 % і 80 % адпаведна [3, с. 68].

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Журналы Комитета Западных губерний / изд. подгот. Т. В. Андреева, И. Н. Вибе, Б. П. Миловидов, Д. Н. Шилов. Т. 1 : 1831–1835 гг. СПб. : Дмитрий Буланин, 2017. 848 с.
2. Журналы Комитета Западных губерний / изд. подгот. Т. В. Андреева, И. Н. Вибе, Б. П. Миловидов, Д. Н. Шилов. Т. 2 : 1836–1840 гг. – СПб. : Дмитрий Буланин, 2021. 800 с.
3. *Лепеш О. В.* Комитет западных губерний: организация и деятельность (1831–1848 гг.). Минск: РИВШ, 2010. 158 с.
4. *Макарэвіч В. С.* Разбор шляхты ў беларускіх губернях Расійскай імперыі (канец XVIII–XIX ст.). Мінск : БДУ, 2018. 315 с.